ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 39 (834) ● Чацвер, 30 снежня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

ПАСПЯХОВА ВЫКОНВАЦЬ ПРАДВЫЗНАЧЭННІ ПАРТЫІ

Усе савецкія людзі, уся сусветная грамадскасць знаходзяцца пад уплывам глыбокіх ідэй і планаў XXIV з'езда КПСС.

Здзяйсняючы рашэнні з'езда ў галіне адукацыі, мы заўсёды памятаем аб адказнасці перад краінай, таму што праблемы адукацыі пранізваюць усе сферы жыцця грамадства.

Перш за ўсё вышэйшая школа нясе адказнасць за навукова-тэхнічны прагрэс, г. зн. за самае галоўнае, што вызначае выкананне планаў дзевятай пяцігодкі. Выступаючы на XXIV з'ездзе КПСС з дакладам, А. М. Касыгін сказаў: «Той, хто ў гэтыя гады паступіць у школы, будзе развіваць эканоміку і культуру краіны ў 90-х гадах нашага стагоддзя і ў пачатку XXI стагоддзя. Праграмы і метады навучання ў школах, тэхнікумах, ВНУ павінны ўжо зараз ўсё больш улічваць перспектывы развіцця навукі і тэхнікі». У гэтай сувязі ўжо зараз кафедры універсітэта працуюць над аптымальным зместам навучання па кожнай спецыяльнасці.

Першаступенная задача універсітэта заключаецца ў тым, каб выпускаць спецыялістаў, валодаючых глыбокімі ведамі ў фундаментальных галінах навукі. Іменна гэтыя веды дазваляюць выпускніку універсітэта ісці ў нагу з прагрэсам навукі і тэхнікі, параўнаўча лёгка адаптавацца ў вытворчых умовах. А для гэтага кожны студэнт абавязан вывучаць навейшыя дасягненні навукі і тэхнікі, авалодваць сучаснымі метадамі навуковых даследаванняў, павялічваць у сваёй падрыхтоўцы ўдзельную вагу самастойнай работы.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ДА ПАСЛУГ СТУДЭНТАЎ

У новым навучальным годзе студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і іншых факультэтаў, якія будуць спецыялізавацца ў галіне вылічальнай матэматыкі, атрымаюць магчымасць праверыць свае тэарэтычныя веды на электронна-вылічальнай машыне «Мінск-32», якая ўстаноўлена ва універсітэце і цяпер праходзіць апошнія эксперыментальныя выпрабаванні.

Увод у дзеянне гэтай машыны будзе садзейнічаць не толькі навучальнаму працэсу студэнтаў, але і новым навуковым даследаванням, дапаможа павялічыць аб'ём гаспадарча-дагаворных работ.

ПЕРАДНАВАГОДНІЯ ІНТЭРВ'Ю

НА ПАРОЗЕ ВЫПУСКУ

Незвычайнае ажыўленне пануе ў апошнія снежаньскія дні ва ўсіх карпусах універсітэта. І гэта зразумела: на парозе — Новы год. А да яго прыходу трэба расквітацца з залікамі— гэта ж абавязкова. Інакш не будзе той весялосці і радасці, якія ўпрыгожваюць свята. Асабліва хвалюючая пара ў выпускнікоў, студэнтаў пятых курсаў.

Цікава, аб чым яны цяпер мараць, да чаго імкнуцца?

Звяртаемся да студэнткі-выпускніцы геаграфічнага факультэта Тані **Сідаравай.**

— Новы год ваша любімае свята?

— Так і не так. Так — таму што яно самае вясёлае і прыгожае. Не так — таму што ёсць яшчэ і 8 Сакавіка!

— Праводзячы 1971 год, па сутнасці вы праводзіце і свае студэнцкія гады. З якім пачуццём вы падыходзіце да гэтай падзеі?

— Перш за ўсё, у мяне асабіста вырываецца ўздых палёгкі. Што ні кажы, а памучыліся. Ну, а потым прыходзіць думка, што развітваемся з універсітэтам назаўсёды, што больш ніколі не вернешся ў гэтыя сцены, і становіцца вельмі сумна. Усё-такі лепшае, што было ў нас, звязана са студэнцтвам.

— Таня, аб здзяйсненні якіх жаданняў у 1972 годзе вы марыце?

— Па-першае, вельмі хочацца, каб мяне накіравалі на работу ў тэхнікум, хоць і ў школе буду працаваць з задавальненнем. Па-другое, цягне падарожнічаць. Аб гэтым я марыла з маленства, яшчэ калі мы жылі на Сахаліне. Мне пашчасціла пабываць у многіх гарадах нашай краіны. Была ў Прыбалтыцы. А вось на III курсе ездзіла са студэнцкай групай у Балгарыю. І, ведаеце, чым больш пазнаеш новых мясцін, новых, вельмі цікавых людзей, тым больш хочацца вандраваць. Думаю, што 1972 год прынясе новыя паездкі, новыя сустрэчы.

— Дзе вы збіраецеся сустрэць свята?

— Абавязкова са сваімі бацькамі і роднымі. Я лічу, што Новы год — сямейнае свята.

— Вашы пажаданні студэнтам універсітэта?

— Усім быць па-сапраўднаму вясёлымі і шчаслівымі 31 снежня і з самага пачатку 1972 года. І яшчэ: няхай у новым годзе кожны навярстае ўсё тое, што не паспеў зрабіць у 1971-м.

Е. ШЫЦІК.

У БУДУЧАЕ — З НОВЫМІ ПЛАНАМІ

З задавальненнем падводзіць вынікі адыходзячага года калектыў універсітэцкай бібліятэкі. Шмат было зроблена за гэты час па прапагандзе матэрыялаў XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ. Былі арганізаваны кніжныя выстаўкі, састаўлены бібліяграфічныя картатэкі.

Да 50-годдзя універсітэта выдадзен бібліяграфічны ўказальнік «Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна». Бібліятэка прыняла ўдзел у арганізацыі юбілейнай выстаўкі прац навуковых супрацоўнікаў БДУ, на якой было прадстаўлена звыш 1000 экземпляраў кніг.

Радаснай падзеяй у 1971 годзе быў для нас пераход бібліятэкі на ступеньку вышэй — з III групы ў II. Гэта дае нам магчымасць палепшыць работу. Мяркуем у наступным годзе правесці рад пераўтварэнняў у арганізацыі фондаў, пойдзем па шляху далейшай дыферэнцыяцыі абслугоўвання чытачоў. Цяпер вывучаем гэтыя пытанні, каб прыступіць да іх ажыццяўлення на рэальнай аснове, улічваючы канкрэтныя ўмовы універсітэта.

І. АРЭХОЎСКАЯ,
дырэктар бібліятэкі.



Лекцыю па метадах вылічэння для студэнтаў IV курса факультэта прыкладной матэматыкі чытае дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі **У. В. Бабкоў.**

Фота **Д. Чаховіча.**



ПАСПЯХОВА ВЫКОНВАЦЬ ПРАДВЫЗНАЧЭННІ ПАРТЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Да гэтай пары асноўнай задачай універсітэтаў была падрыхтоўка спецыялістаў для навуковых установ (пераважна ў галіне фундаментальных навук) і для выкладчыцкай дзейнасці. Сёння спецыялісты універсітэцкага профілю патрабуюцца і на вытворчасці. Больш шырокае выкарыстанне дасягненняў навукі патрабавала адпаведных змен ва універсітэцкай адукацыі. Адначасова павышаецца роля універсітэта ў падрыхтоўцы кваліфікаваных выкладчыкаў для вышэйшых навучальных устаноў. Пастаноўка такіх задач перад універсітэтам патрабуе сістэматычнага ўдасканалення зместу, метадаў выкладання, навукова-тэхнічнай накіраванасці навучальнага працэсу, далейшага спалучэння навучання з навуковай работай і ўсямернага развіцця навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў. Гэта вельмі складаныя і адказныя задачы, якія неабходна рашаць ужо ў новым годзе. Неабходнасць павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў ставіць галоўнае пытанне — удасканаленне метадаў выкладання.

У новых умовах асаблівая ўвага будзе ўдзелена такім метадам навучання, якія забяспечаць падрыхтоўку ініцыятыўных, творчых спецыялістаў. Гэтага можна дасягнуць, толькі прымяняючы ўвесь комплекс метадаў вучэбнай работы, выпрацаваных практыкай, разумна спалучаючы традыцыйнае і новае ў навучанні. Для гэтага неабходна, каб праца ў лабараторыях, навуковых гуртках стала неад'емнай часткай навучальнага працэсу. Ставіцца пытанне аб адлюстраванні яе ў вучэбных планах.

Асаблівых клопатаў патрабуе арганізацыя вучэбнай работы з першакурснікамі. Іменна на I курсе ідзе працэс адаптацыі студэнтаў у новых умовах, і для некаторых студэнтаў ён не заўсёды аказваецца паспяховым.

У новых вучэбных планах, пачынаючы з 1972 года, для першых курсаў усіх спецыяльнасцей уводзіцца дысцыпліна «Уводзіны ў спецыяльнасць». Мэта яе—пазнаёміць студэнтаў з месцам іх будучай спецыяльнасці ў сістэме грамадскай вытворчасці і з асноўнымі функцыямі спецыяліста на вытворчасці, а таксама элементамі навучальнага працэсу, расказаць аб метадах творчага авалодання ведамі, самастойнай работы, збору інфармацыі, аб магчымасці ўключыцца ў даследчую і грамадскую работу. Праграма гэтай дысцыпліны будзе ўключаць экскурсіі на прадпрыемствы, у лабараторыі, навуковыя ўстановы, рэферыраванне літаратуры па спецыяльнасці. Гэтыя дысцыпліны будуць чытаць вядучыя прафесары прафіліруючых кафедр.

Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць планаванню самастойнай работы першакурснікаў, дакладна вывучаць бюджэт часу студэнтаў.

Значнага паляпшэння патрабуе работа бібліятэкі. Сюды павінны прыйсці новыя сістэмы: стварэнне мікрафільмаў па вучэбнай літаратуры, здыманне фотакопій з табліц, графікаў і іншых ілюстратыўных матэрыялаў, якія змешчаны ў дэфіцытных кнігах.

Выключна важную ролю ў здзяйсненні рашэнняў XXIV з'езда КПСС адыгрывае ўдасканаленне камуністычнага выхавання студэнтаў, што патрабуе ўдасканалення ідэалагічнай работы, паслядоўнай барацьбы супраць апалітычнасці, уласніцкіх перажыткаў і мяшчанскага настрою, супраць пранікнення ў асяроддзе студэнтаў буржуазных і рэвізіянісцкіх поглядаў.

У рашэнні гэтых задач вялікая роля належыць кафедрам грамадскіх навук, усяму выкладчыцкаму калектыву.

У новым годзе будзе больш удзелена ўвагі паляпшэнню умоў працы, быту і адпачынку студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. З гэтых пазіцый будзе здзяйсняцца падыход да будаўніцтва інтэрнатаў, арганізацыі сістэмы харчавання і медыцынскага абслугоўвання, спартыўна - аздараўленчай работы.

Шматтысячны калектыў універсітэта, кіруючыся рашэннямі XXIV з'езда КПСС, задачамі, пастаўленымі перад вышэйшай школай у прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў, робіць усё магчымае для таго, каб падняць узровень спецыялістаў на новую, яшчэ больш высокую ступень.

В. ДАЛГАРУКАЎ,

Плённа завяршае 1971 год калектыў кафедры неарганічнай хіміі. Асабліва істотны вынік прынеслі навуковыя даследаванні вучоных-хімікаў. Супрацоўнікі кафедры атрымалі шэсць аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. Толькі адна лічба, а колькі за ёй напружанай, самаадданай працы!

Моцна сябруе калектыў з многімі прадпрыемствамі рэспублікі, выконвае шмат работ па гаспадарчых дагаворах. Сёлета такіх работ выканана на суму 175 тысяч рублёў.

НА ЗДЫМКУ: дацэнт В. В. Свірыдаў і тэхнік лабараторыі электроннай мікраскапіі А. Камароў у час правядзення чарговага даследавання.

Фота Д. Чаховіча.

НЕЗВЫЧАЙНАЯ ВЫСТАЎКА

Пакуль што гэта толькі адзін невялікі пакой са шклянымі шафамі і паліцамі, на якіх размешчаны экспанаты. Але тут усё, як у сапраўдным музеі, нават цішыня і ўтульнасць тыя ж. Час ад часу прыходзяць наведвальнікі, госці універсітэта, навучэнцы мінскіх школ. Пакой гэты знаходзіцца на пятым паверсе галоўнага корпуса.

Добрымі вачыма глядзіць на нас са сцяны Ільіч. Партрэт з інкрустацыяй з дрэва падаравалі да 50-годдзя універсітэта навучэнцы Бабруйскага мастацкага вучылішча № 15.

Імкліва цягнецца ўгору бліскучая алюмініевая ракета — падарунак Мінскага вышэйшага ваенна-інжынернага вучылішча.

Каля гэтай шафы спыніцца кожны. За шклом простая паржавелая гільза на камені. Там, усярэдзіне, знаходзіцца зямля з гераічнай Брэсцкай крэпасці. Салігорскія шахцёры прыслалі ў падарунак саляную глыбу з высечаным на ёй сілуэтам правадыра. Тут жа шахцёрская каска і малаток.

Падарункаў шмат, як і шмат сяброў, віншаваўшых юбіляра. Сярод іх прадстаўнікі універсітэтаў сацыялістычных краін, замежныя студэнты, якія навучаюцца ў Беларусі.

Асобнае месца ў гэтай незвычайнай выстаўцы займаюць Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР і прывітальнае пісьмо ЦК КПБ, а таксама прывітальныя пісьмы розных вну краіны.

Як старэнькая маці зберагае вестачкі ад сваіх дзяцей, так зберажэ універсітэт віншавальныя тэлеграмы сваіх шматлікіх сыноў і дачок, выпускнікоў розных факультэтаў.

Выстаўка — своеасаблівая геаграфічная карта свету. І не толькі таму, што падарункі з розных гарадоў, а яшчэ і таму, што яны — малюначкі жыцця нашых сяброў. Гэта — вышываныя дарожкі, альбомы, выдатна зробленыя з пластыку і металу пейзажы.

Хутка гэты пакой стане музеем. Як назавуць яго тады? Сказаць цяжка. Толькі, здаецца, на дзвярах будзе вісець зроблены студэнтамі інстытута механізацыі вялікі каляндарны ліст з памятнай усім нам датай юбілею універсітэта.

Л. ДРУЗЕВА.

ЩЧАСЦЯ ВАМ, ПЯЦІКУРСНІКІ!

У актавай зале галоўнага корпуса гоман, вяселле, музыка. У студэнтаў пятага курса журфака свята — апошні званок. Ён ужо адзвінеў для іх, і больш ніколі не збяруцца яны на лекцыі. Ніколі... Колькі разоў, пачуўшы яго, спяшаліся, каб не спазніцца на заняткі, або з нецярпеннем паглядвалі на гадзіннікі: хутчэй бы ён празвінеў! А сёння гэта незвычайны званок: ён склікаў сваіх выпускнікоў на сцэну. І вось яны, восемдзесят два студэнты-журналісты, у прыгожым святочным адзенні, усхваляваныя і шчаслівыя. Іх вітаюць першакурснікі, студэнты II, III і IV курсаў, жадаюць паспяхова здаць апошнія экзамены, добрай працы, шчасця. А потым выпускнікі ў невялічкіх сцэнках расказалі аб сваім жыцці ва універсітэце, аб тым, як гартавалася і мацнела іх дружба.

Н. САКАЛОВА.

НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ

У ПАЎСЯДЗЁННЫМ КЛОПАЦЕ

Складаны і шматгранны працэс падрыхтоўкі і выхавання студэнтаў аграмадна звязаны і ў многім вызначаецца ўзроўнем і якасцю пастаноўкі і арганізацыі вучэбнай, навуковай і выхаваўчай работы на кафедры. Менавіта тут вырашаюцца важнейшыя вучэбныя задачы, арганізуецца самастойная работа студэнтаў, навуковая праца сталых і маладых даследчыкаў, фарміруецца ў студэнтаў навуковы, марксісцка-ленінскі светапогляд, навыкі і інтарэс да выбранай спецыяльнасці.

У паспяховым вырашэнні гэтых важных задач галоўная роля належыць выкладчыцкаму саставу. І не выпадкова на кафедры гісторыі СССР, якую ўзначальвае дацэнт П. З. Савачкін, удзяляецца вялікая ўвага павышэнню навуковай і метадычнай кваліфікацыі выкладчыкаў. У апошнія гады выкладчыцкі састаў кафедры рэзка ўзрос і памаладзеў. Цяпер тут з 16 выкладчыкаў 14 маюць вучоныя ступені і званні. Толькі ў 1971 годзе абаранілі кандыдацкія дысертацыі Е. Ф. Саўчук і І. А. Літвіноўскі. Падрыхтаваў і прадставіў да абароны кандыдацкую дысертацыю ст. выкладчык Л. А. Міхайлоўскі, завяршае напісанне кандыдацкай дысертацыі выкладчык А. А. Стуканаў.

Памятаючы аб тым, што лекцыя — асноўная форма вучэбнай работы, на кафедры клапатліва выхоўваецца метадычнае майстэрства, лектарская зацікаўленасць сваім прадметам. Сістэматычна праводзяцца ўзаемнаведванні лекцый і практычных заняткаў з далейшым абмеркаваннем на пасяджэннях кафедры і секцый, абмяркоўваюцца тэксты лекцый. Актыўна ўдзельнічаюць выкладчыкі ў навукова-метадалагічным семінары, якім кіруе прафесар Р. А. Левін.

Многа ўвагі члены кафедры ўдзяляюць развіццю інтарэсу да вывучаемага прадмета, выпрацоўцы навыкаў самастойнай работы, эфектыўна выкарыстоўваючы практычныя і семінарскія заняткі, выкананне курсавых і дыпломных работ. І таму студэнты факультэта ахвотна ідуць на кафедру для выканання курсавых і дыпломных работ. У 1971 годзе на кафедры выкананы 153 курсавыя работы студэнтамі стацыянара і вячэрняга аддзялення, з іх 151 — на добра і выдатна, і 51 — дыпломная работа.

Рыхтуецца да абароны ў будучым годзе 95 работ. Ужо абмеркаваны і зацверджаны тэмы, усе дыпломнікі далажылі, як ідуць у іх справы.

Нямала зроблена на кафедры па падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Вялікая работа здзейснена дацэнтам А. І. Кажушковым па падрыхтоўцы да выдання юбілейных матэрыялаў. Знаходзіцца ў наборы «Хрэстаматыя па гісторыі БССР» (аўтары П. З. Савачкін, А. П. Ігнаценка, У. Н. Сідарцоў, А. І. Сідарэнка). Здадзен у друк вучэбны дапаможнік для завочнікаў «Практыкум па гісторыі СССР» (аўтар У. Н. Сідарцоў, пад рэдакцыяй П. З. Савачкіна).

Асаблівы клопат калектыву — падрыхтоўка высокакультурных, шырокаадукаваных выхаванцеляў маладога пакалення — будучых настаўнікаў. Вось чаму пастаянна ў цэнтры ўвагі кафедры і партыйнай групы педагагічная практыка і работа куратараў. Куратарскія абавязкі выконваюць многія выкладчыкі кафедры: Ю. І. Драгун, Е. Ф. Саўчук, Ф. І. Адашчык, Л. А. Калымага, У. А. Ціток і іншыя. Куратары сістэматычна выступаюць са справаздачамі на пасяджэннях кафедры і партгрупы, выкарыстоўваюць традыцыйныя і шукаюць новыя формы эфектыўнага выхаваўчага ўздзеяння на моладзь.

У апошнія гады больш ажыўлена вядуцца студэнцкія даследаванні. У трох кафедральных гуртках працуюць 83 студэнты. У сёлетнім годзе на XXVIII студэнцкай канферэнцыі было заслухана 22 даклады, 6 — на юбілейнай. 13 работ было прадстаўлена на рэспубліканскі агляд, дзе яны ўдастоены I і II катэгорый.

Цяпер кафедра разгарнула падрыхтоўку да вялікай падзеі — 50-годдзя ўтварэння СССР. Перагледжана тэматыка спецкурсаў і спецсемінараў, уведзен новы спецсемінар «Утварэнне СССР». Да гэтай знамянальнай даты рыхтуецца спецыяльная выстаўка, распрацоўваюцца сацыялістычныя абавязацельствы.

У новым годзе калектыў чакае шмат цікавых, разнастайных і важных спраў, мэта якіх — выхаванне дастойных спецыялістаў.

М. МАЦЕЙКА.

ШЛЯХ ДА ПРАФЕСІІ

Спецыялізацыя будучых газетчыкаў, радыё- і тэлежурналістаў, іх шлях да прафесіі пачынаецца на кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку і кафедры тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання. Тут пад кіраўніцтвам вопытных журналістаў - выкладчыкаў студэнты разглядаюць пытанні жанраў, вывучаюць тэхніку, з якой у будучым прыйдзецца працаваць, выяўляюць свае творчыя здольнасці ў практычнай рабоце.

НА ЗДЫМКАХ: 1. Студэнты Л. Халупава, В. Саламаха і М. Галко за выпускам спецыяльнага нумара газеты «Другі курс у друку». 2. Святлана Проніна бярэ інтэрв'ю ў чэмпіёнаў Беларусі ў парным катанні, членаў зборнай рэспублікі па фігурнаму катанню Наташы Цвятковай і Алега Малышава.

Тэкст і фота
С. ЦІВАНАВА.

ФАКУЛЬТЭТ-ЧАРАЎНІК

Зусім не пад Новы год, а 2 разы ў тыдзень, вечарам, адбываюцца з некаторымі студэнтамі казачныя пераўтварэнні. Фізікі становяцца танцорамі, матэматыкі — добрымі прамоўцамі, філолагі — спартсменамі. Толькі робіць гэтыя пераўтварэнні зусім не чараўнік, а факультэт грамадскіх прафесій. Сёлета ён сустракае ўжо свой восьмы Новы год. За гэты час ФГП заняў асаблівае месца сярод іншых грамадскіх арганізацый універсітэта. Зрабіў шэсць выпускаў, падрыхтаваў 959 спецыялістаў: лектараў, піянерскіх важатых, грамадскіх інструктараў і суддзяў па спорту, харэографаў, рэжысёраў, хормайстраў.

Адразу ў верасні факультэт гасцінна запрашае слухачоў, а ў маі спецыяльныя камісіі праводзяць выпускныя экзамены, ацэньваюць поспех маладых лектараў і важатых, аматараў мастацтваў і спорту.

Сёлета на ФГП займаецца 375 чалавек. Вельмі масавым з'яўляецца аддзяленне суддзяў і грамадскіх інструктараў па спорту. Цікава пастаўлена таксама работа з лектарамі, важатымі, якія займаюцца ў гарадскім Доме піянераў.

«Несці высокую сацыялістычную культуру ў масы»— пад такім дэвізам працуюць выкладчыкі і слухачы факультэта. Многія былыя выхаванцы ФГП з поспехам перадаюць зараз набытыя веды іншым. У Уздзенскай СШ Мінскай вобласці працуе выпускнік фізічнага факультэта Мартынчык Міхаіл. Акрамя асноўнага прадмета, ён вядзе ў школе фізічную культуру. Секцыяй штангістаў у АН БССР кіруе Я. Гімельштэйн. В. Голубеў, які скончыў геаграфічны факультэт, кіруе танцавальным калектывам у адной з воінскіх часцей.

Кажуць, што пад Новы год, што ні пажадаецца, усё заўжды адбудзецца, усё заўжды збываецца. Пажадаем жа ФГП рабіць новыя і новыя цуды, расціць многа добрых танцораў, лектараў, рэжысёраў.

П. ЛІДЗІНА.

НАШ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ КЛУБ

ВІНШУЕМ

Для студэнтаў з Камеруна пачатак Новага года супадае з нацыянальным святам — Днём абвяшчэння незалежнасці.

Пасля другой сусветнай вайны Камерун стаў падапечнай тэрыторыяй ААН пад кіраўніцтвам Англіі і Францыі. Ва ўмовах нарастаючай барацьбы камерунскага народа імперыялісты былі вымушаны пайсці на ўступкі. І студзеня 1960 года ў адпаведнасці з рашэннем ААН была абвешчана незалежнасць Рэспублікі Камерун.

Савет Дружбы універсітэта віншуе ўсю многанацыянальную сям'ю студэнтаў з наступаючым Новым годам і жадае вялікага шчасця, новых працоўных перамог у справе будаўніцтва камуністычнага грамадства.

САВЕТ ДРУЖБЫ БДУ.



МАРУ СТАЦЬ ІНЖЫНЕРАМ...

31 снежня кангалезскі народ і ўсе прагрэсіўныя людзі свету адзначаюць 3-ю гадавіну з дня заснавання Народнай рэспублікі Конга і ўтварэння кангалезскай партыі Працы.

У нашым універсітэце на падрыхтоўчым факультэце для замежных студэнтаў вучыцца 9 чалавек з гэтай краіны. Аднаго з іх, прэзідэнта зямляцтва Гатсона Базіля, мы папрасілі расказаць аб сабе і сваіх уражаннях аб вучобе.

— Нарадзіўся я ў 1948 годзе у адной з правінцый Конга. У 1970 годзе закончыў 13 класаў ліцэя. Дзякуючы нястомным клопатам нашай партыі Працы і Саюза Кангалезскай сацыялістычнай моладзі аб павышэнні агульнаадукацыйнага ўзроўню, я быў накіраван на вучобу ў Савецкі Саюз. Я мару стаць інжынерам лесатэхнічнай прамысловасці. Гэту спецыяльнасць я выбраў невыпадкова, таму што наша краіна багата лясамі і наш народ чакае вопытных спецыялістаў.

Пакуль што вучыцца цяжкавата, таму што я яшчэ не зусім добра валодаю рускай мовай. Але дзякуючы выкладчыцы рускай мовы Ляцецкай Але Сяргееўне і маім савецкім сябрам па інтэрнату Міхаілу Туру і Міхаілу Богдану, я хутка ўжо буду ўсё разумець па-руску.

У гэтым годзе я і мае кангалезскія сябры ўпершыню ў сваім жыцці сустракаем свята нашага народа і Новы год далёка ад радзімы.

Ад імя кангалезскіх студэнтаў віншую савецкіх сяброў, студэнтаў і выкладчыкаў з новым, 1972 годам. Жадаю шчасця, здароўя, выдатных поспехаў у вучобе і працы!

* Залік па анатоміі чалавека ў студэнткі II курса біяфака Л. МІСЕВІЧ прымае дацэнт кафедры фізіялогіі і анатоміі чалавека К. І. ГРЫШАН.

* Факультэт спецыяльнай прыкладной матэматыкі. Практыкум па ЭВМ вядзе ст. інжынер вылічальнага цэнтра БДУ І. Б. ГАУРЫС. Ля дошкі — інжынер праектна-тэхналагічнага інстытута «Белмясцпланпраект» П. І. ЯРОШЧЫК.

Фота Д. Чаховіча.





В'ЕТНАМСКІЯ СУСТРЭЧЫ

Сустрэча, на якую запрасіла нядаўна афіша студсавета інтэрната № 1, была своеасаблівай. Яе галоўным удзельнікам стаў Леанід Давыдзенка, ленінскі стыпендыят, студэнт V курса гістарычнага факультэта, які вярнуўся з двухтыднёвай паездкі ў Дэмакратычную Рэспубліку В'етнам. Там, разам з іншымі прадстаўнікамі нашай краіны, Леанід уручаў падарункі савецкай моладзі в'етнамскім сябрам, дастаўленыя ў порт Хайфон цеплаходам «Піянерская праўда». Былі там падарункі і ад нашага універсітэта. Сродкі ад суботнікаў, у якіх удзельнічалі тысячы студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, пойдуць на будаўніцтва ў Ханоі дзіцячай бальніцы імя паўднёва-в'етнамскага героя Нгуен Ван Чоя. Па рашэнню СФДМ будоўля аб'яўлена інтэрнацыянальнай.

Дзе б ні былі пасланцы савецкай моладзі, усюды іх сустракалі шчыра і сардэчна. Надоўга запомніцца Леаніду Давыдзенку сустрэча з шахцёрамі правінцыі Куангмінь.

— І сёння ўмовы працы шахцёраў нялёгкія. Увесь час трэба працаваць у напружанні: амерыканскія самалёты не раз з'яўляюцца ў небе, нягледзячы на ўсе заявы свайго ўрада аб спыненні агню. Шахцёры горача дзякавалі савецкім людзям за бескарысную дапамогу і падтрымку. Яны прасілі нас перадаць усяму савецкаму народу самыя найлепшыя пажаданні.

В'етнамцы добра ведаюць нашу Беларусь. «Вашы магутныя МАЗы і БелАЗы, трактары «Беларусь» дапамагаюць нам будаваць сацыялізм», — гаварылі яны.

Усхвалявалі ўсіх нас песні, якія прагучалі ў канцы сустрэчы. Пасля выканання «Песні саюза моладзі В'етнама», «Песні пра дарогу № 9», в'етнамскія рабочыя заспявалі «Кацюшу», а затым «Песню артылерыстаў». Мы не маглі утрымацца і таксама падхапілі мелодыі, якія нарадзіліся ў гады выпрабаванняў нашага народа, а сёння дапамагаюць жыць і змагацца народу В'етнама.

Леанід расказаў пра сустрэчы з ханойскімі піянерамі, студэнтамі політэхнічнага інстытута, супрацоўнікамі газет.

— Цікавай была сустрэча з нядаўнім выпускніком БДУ, фізікам Хуан Ван Шонам, Хуан успамінаў гады вучобы, сваіх беларускіх сяброў. Веды, якія ён атрымаў у Савецкай краіне, зараз перадае іншым, працуючы выкладчыкам у сярэдняй навучальнай установе. Даведаўшыся, што я з БДУ, Хуан перадаў шчырае прывітанне ўсім студэнтам і выкладчыкам універсітэта.

У заключэнне Леанід Давыдзенка сказаў:

— За час, праведзены ў ДРВ, мы яшчэ раз пераканаліся ў мужнасці і бясстрашнасці в'етнамскага народа, у вернасці і непарушнасці нашай дружбы, якая мацнее і развіваецца на творчай аснове марксізму-ленінізму.

С. ЛІСОЎСКІ, студэнт.

ДЗЕ ТЫ, СЦЯЖЫНКА ШЧАСЦЯ?

Чытальная зала № 3 універсітэцкай бібліятэкі перапоўнена. Шмат спраў у гэтую гарачую пару ў кожнага. Але вось на некаторы час студэнты адрываюцца ад сваіх заняткаў. Прычына гэтага — дыспут па кнізе Анатоля Ананьева «Вёрсты кахання», які падрыхтавалі кафедра рускай савецкай літаратуры і супрацоўнікі бібліятэкі.

Уступнае слова робіць кандыдат філалагічных навук, дацэнт Ніна Мікалаеўна Рамашка. Яна коратка спыняецца на гісторыі напісання рамана, на яго асаблівасцях. Адзначае ідэйную накіраванасць твора. А потым сваю ацэнку раману дае студэнтка I курса філалагічнага факультэта рускага аддзялення Люда Арбузава:

— На мой погляд, кніга ў мастацкіх адносінах не аднолькавая. Другая частка напісана лепш, чым першая. Што датычыцца характараў, то мяне асабліва зацікавіў лёс Ксені, вельмі хвалявалася за Раю.

Выступае аднакурсніца Люды Ліля Замараева:

— Па-мойму, у творы больш адмоўнага, чым станоўчага. Цяжкаватая мова рамана: адзін сказ часам займае старонку. Вобраз Фядосава мне не спадабаўся. Яго каханне прыносіць зло.

Шмат аб'ектыўных заўваг робяць студэнты фізічнага факультэта.

Слава Сычоў, II курс:

— Я хачу сказаць наконт вобраза Яўгена Іванавіча. Лічу, што ён станоўчы. Вось падставы: дзевятнаццацігадовым юнаком пайшоў на фронт, праявіў гераізм, атрымаў званне Героя Савецкага Саюза. А што няўдачнае каханне, дык такое можа здарыцца з кожным.

Яго падтрымліваюць А. Кулагін, Ю. Гацкевіч, А. Гаркушаў, а таксама студэнтка філфака Л. Агароднік. Разгортваецца дыскусія, ідуць спрэчкі, паступаюць удакладненні. А ўвогуле сыходзяцца на адным: кніга надзвычай карысная, асабліва для моладзі. Прачытаўшы яе, ёсць над чым падумаць, паразважаць, вызначыць сваё месца ў жыцці, параўнаць яго з лёсам герояў.

У заключным слове Н. М. Рамашка адзначыла, што дыспут праходзіў у вельмі творчых абставінах. Вызначыўся індывідуальны падыход да кнігі кожнага выступаючага, сярод якіх большасць зрабіла правільны аналіз. Аўтар параўноўваўся ў тых ці іншых адносінах з Гогалем, Л. Талстым, Паўстоўскім. Гэта, безумоўна, гаворыць аб вялікім поспеху маладога празаіка.

У. РУБАНАЎ, студэнт.

І ВОСЬ Я Ў СТАЛІЦЫ БЕЛАРУСІ...

У першы дзень Новага —1972 года кубінскі народ і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначаць 13-ю гадавіну Кубінскай рэвалюцыі.

Мінула 10 год з таго часу, як да нас ва універсітэт прыехалі першыя пасланцы гэтай краіны. Многія з былых кубінскіх выпускнікоў падрыхтоўчага факультэта сталі выдатнымі спецыялістамі. Цяпер на гэтым факультэце вучыцца 22 прадстаўнікі рэвалюцыйнай Кубы.

Мы папрасілі прэзідэнта зямляцтва кубінскіх студэнтаў Мігіэля Пуліда расказаць пра сябе і пра сваіх сяброў.

— У Савецкім Саюзе я ўжо трэці раз. Упершыню прыехаў у 1961 годзе. Мне тады было 15 гадоў. Я вучыўся ў Гаванскай спецыялізаванай радыётэхнічнай школе. Вось тады мяне і маіх сяброў накіравалі ў адзін з гарадоў Грузіі для практычнай вучобы.

У 1967 годзе я наведаў калыску рускай рэвалюцыі — Ленінград. Там я вучыўся 6 месяцаў. Надоўга застануцца ў маёй памяці выдатныя гістарычныя мясціны гэтага горада. І вось цяпер я ў сталіцы Беларусі — Мінску. Скажу шчыра — горад мне вельмі спадабаўся і асабліва людзі, хоць я ўсяго жыву ў Мінску каля месяца. Мае сябры прыехалі раней. Яны ўжо правучыліся каля чатырох месяцаў. Я крыху адстаю. Але ўпэўнен, што хутка наганю ўпушчанае, бо мне і маім сябрам дапамагаюць выкладчыкі і савецкія сябры па інтэрнату.

Хочацца ад усяго сэрца перадаць гарачае прывітанне савецкім людзям ў гонар нашага свята і Новага, 1972 года і пажадаць усім моцнага здароўя, поспехаў у працы і вучобе.

Інтэрв'ю правёў В. КАЛАДЗІНСКІ.

НА СПАТКАННЕ З ЛЕСАМ

Гаркаваты пах хвоі абдае з ног да галавы, калі хто-небудзь урываецца ў тралейбус, зачэпліваючы ўсіх лапкамі калючай ёлкі. І чамусьці ў гэты час мне адразу ўяўляецца малюнак яе папярэдняга жыцця ў скрозь прамарожаным лесе і вельмі захочацца туды.

Дзімку, напэўна, таксама цягне да ёлак, таму што ён зноў збірае групу, рыхтуецца да паходу.

Дзіма Варыончык — студэнт III курса філфака, заўзяты турыст. Давайце пацікавімся, як ідзе падрыхтоўка да паходу, што хвалюе.

— Дзіма, некалькі слоў аб маршруце.

— План паходу толькі намечан. Але думаем пайсці так: Мінск — Маладзечна— Нарач— Швакшты — Блакітныя азёры — Свір — Мінск. Мэта маршруту — вывад групы на месца турысцкага злёту, прысвечанага 50-годдзю ўтварэння СССР, да літоўскай граніцы ля возера Швакшты, дзе мы сустракаемся з турыстамі Вільнюскага універсітэта. На сустрэчы будзе вядомы альпініст СССР Якаў Рыгоравіч Аркін, даўні сябар нашага турклуба.

— Укамплектавана група! Колькі ў ёй чалавек?

— Наш паход арганізуецца на філфаку. А там жа дэфіцыт на хлопцаў. На ўсе віды спорту іх не хапае, тым больш на турызм. Паходы яны чамусьці ігнаруюць. Запрашаем дзяўчат, а рабят вярбуем на другіх факультэтах.

— А як з амуніцыяй! Зноў будзеш бегаць па пракатах, як восенню!

На гэты раз амуніцыяй, акрамя штармовак, нас абяцае забяспечыць турклуб. А наконт лыжаў прыходзіцца задумацца: ці патрэбны яны наогул. Дастаткова ўспомніць мінулагодні вопыт, калі мы лыжы неслі як дадатак да рукзака. Цяперашняе надвор'е таксама нічога добрага не абяцае. Дарэмна на ўсіх лекцыях глядзіш у вакно — снегу няма і няма...

— Як будзе з харчаваннем?

— Уласна кажучы, гэта ўжо ўсё абдумана: тушонка будзе, не то што ў мінулым паходзе, калі мы елі «ні рыбу, ні мяса, а «Снеданне турыста».

— Ну і апошняе пытанне: што даюць табе вось такія паходы, што цябе цягне туды?

— Гэта самы цудоўны сродак адпачыць ад сесіі, ад горада, калі хочаце, ад звычайнага самога сябе.

Так што калі хто не ведае, чым заняцца ў час канікул, калі каму дома сумна, то ідзіце ў паходы. Не пашкадуеце. Некалькі чалавек яшчэ нават можа ўладзіцца ў Дзіміну групу.

Т. СЕНЧЫК.

У ЧЫТАЛЬНАЙ ЗАЛЕ. *Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

ПЕДАГАГІЧНЫ САКРЭТ

— Той дзень быў зусім не адметны для Маргарыты Канстанцінаўны Каваленка. Пасяджэнне на кафедры, затым чатыры гадзіны заняткаў на стадыёне. Так сабе, як заўсёды: кароткія размінкі, бег, гутаркі з падапечнымі і зноў — бег, бег... Гэтае практыкаванне, бадай, самае эфектыўнае ў арсенале трэніроўкі любога спартсмена, не гаворачы ўжо аб тых, хто займаецца лячэбнай фізкультурай. Аднак заняткі са студэнтамі-лячэбнікамі ў значнай ступені адрозніваюцца ад заняткаў тых, каму даюцца поўныя фізічныя нагрузкі. Сам падыход, увага да студэнтаў-лячэбнікаў у аснове сваёй своеасаблівыя. У даным выпадку педагог кіруецца не сваім планам, а магчымасцямі сваіх выхаванцаў.

— Памятаю, — гаворыць Маргарыта Канстанцінаўна, —прыйшла да мяне адна дзяўчына, пазнаёміліся: — Іра... З філалагічнага факультэта. Урачы параілі займацца лячэбнай фізкультурай.

— Ну што ж, — сказала ёй тады, — будзем сумесна лячыць запушчаную вашу сістэму. А ў адказ без ценю сумнення: «Бегаць дыстанцыі я не буду ўвогуле».

Па-праўдзе сказаць, мяне гэта ўразіла: было некалькі выпадкаў, калі адмаўляліся, ды не так адразу і катэгарычна.

— Нічога тады ёй не сказала, ведала: з цягам часу зразумее памылковасць сваёй думкі і будзе дакараць сябе, але цяпер... Трэба даць нейкі стымул дзяўчыне, дапамагчы ёй адчуць важнасць кожнай трэніроўкі.

З якой неахвотай, абыякавасцю і крыўдай былі пераадолены першыя чатырыста метраў. Затым яшчэ некалькі разоў па сто метраў уперамежку з практыкаваннямі для мышц. Балюча было глядзець, як новенькая пераадольвала гэтыя бар'еры. А побач былі такія ж —група лячэбнікаў. Толькі бегалі яны з ахвотай, выконвалі практыкаванні з асалодай, і ззяла на іх ружовых тварах задаволеная ўсмешка. Вядома, Іра не магла гэтага не заўважыць. «Але як можна столькі бегаць? Я ж не вытрымаю!» — так, напэўна, яна думала.

Пасля заняткаў, якраз у момант, калі гаварлівы студэнцкі натоўп выходзіў са стадыёна, на плячо Іры лягла нечая даверлівая рука. «Пачакай, Іра, ёсць размова». Дзяўчына і без таго не магла дачакацца канца заняткаў, а тут яшчэ «пачакай»...

Няўжо людзі не разумеюць, чаго каштуе для студэнта свабодная хвіліна? Ды што там хвіліна, ды яшчэ свабодная — залікі ж над самай галавой! Вочы Іры сустрэліся з вачыма Маргарыты Канстанцінаўны, цёплымі, уважлівымі, спакойнымі. Можа гэтая спакойнасць ды пяшчотнасць і супынілі дзяўчыну. Размова ўдалася. Пасля гэтага яна не спяшалася ў інтэрнат: варта было яшчэ раз падумаць, узважыць і сказаць свайму выкладчыку: «Дзякую!»

Прайшоў час.

Заканчваецца чарговая трэніроўка ў групе лячэбнай фізкультуры.

— Пайшоў апошні круг,— кідае наўздагон сваім выхаванцам Маргарыта Канстанцінаўна.

Віраж, пяцьдзесят метраў, яшчэ віраж, і дыстанцыя застаецца за плячыма.

— 16.42 — зусім нядрэнна. Як адчуванне, дзяўчаткі?

— Цудоўна, Маргарыта Канстанцінаўна!

Да выкладчыцы падбегла невысокага росту русавалосая дзяўчына. Яна яшчэ здалёк радасна ўсміхалася, і па твары яе відаць, што вынікам задаволена.

Ды гэта ж тая самая Іра! Толькі тут да мяне прыходзіць здзіўленне, якому б патрэбна было ўзнікнуць у час, калі дзяўчаты адмахвалі кіламетры на дыстанцыі. Дык вось як! Маргарыта Канстанцінаўна разумее маё здзіўленне. Так, давялося паспрачацца з характарам, ды ўсё гэта ў мінулым. Зараз Іра з такой лёгкасцю адмервае дыстанцыі, што аж мне зайздросна становіцца.

Я добра разумею, што значыцца пад словам «паспрачацца». Гэта і недарэчныя зрывы і фанабэрыстасць дзявочага характару, і шматлікія нязначныя хібы, якія перашкаджалі дзяўчыне адчуць неабходнасць трэніровак.

— Цяпер гэта ў мінулым.

Ці так? Проста такі педагог, як Маргарыта Канстанцінаўна Каваленка, не загадвае наперад цяжкасці, а вырашае іх штодыннёва, пастаянна і паспяхова.

Г. ЧЫГІР.

СВОЙ СТЫЛЬ

ГУМАРЭСКА

Падрыхтоўка да экзаменаў — гарачая пара ў студэнцкім жыцці. Тут усё трэба прадумаць да дробязей: канспекты, запісы, падручнікі павінны быць пад рукой. Калі да экзамена застаецца два дні — студэнт чытае падручнік, адзін — абмяжоўваецца канспектам, ніводнага — памяццю. У кожнага свой падыход. І вынікі таму неаднолькавыя.

«Тут патрэбна мець свой стыль», — вырашыў я. А для гэтага трэба паспытаць вопыт старшакурснікаў. Хто-хто, а яны добра ведаюць, што такое экзаменацыйная бяссонніца.

Пацікавіўся ў аднаго, што ён робіць, каб выцягнуць лёгкі білет. Не прызнаўся, але я не даваў яму спакою ні днём, ні вечарам. Старшакурснік не вытрымаў і таямніча сказаў:

— Калі хочаш, каб пашанцавала па хіміі, дык памаж чарнілам пяткі і кончыкі пальцаў на нагах. Здорава дапамагае.

— Я не здаю хімію, — расчараванa сказаў я.

Старшакурснік паправіў акуляры, быццам яны перашкаджалі ўспомніць, а потым падняў палец угару.

— Во! Бяры білет левай рукой з сярэдзіны. Цяжкі наверсе. Або закрый вочы і бяры, што трапіцца пад руку.

— Як жа я буду стаяць перад выкладчыкам з закрытымі вачыма? Не, лепш што-небудзь іншае.

Старшакурснік здзіўлена пацісnуў плячыма і працягваў ужо крыху цішэй:

— За час да экзамена пакладзі пяць капеек пад левую і столькі ж пад правую пятку. Лепш пяць рублёў. Тады атрымаеш выдатную адзнаку. На чатыры— завяжы вузлы на ражках насавой хусткі, а калі ляжаш спаць, то кладзі пад ногі падушку, а пад галаву падручнікі.

Ён нават падморгнуў: «Ні пуху, ні пер'я!»

Праз некалькі дзён ужо пасля майго экзамена мы зноў спаткаліся ў чытальнай зале.

— З чым павіншаваць?— пахлопаў ён мяне па плячы.

— Засыпаўся... ды яшчэ мазалі нацёр на нагах ад пятакоў.

— Затое ж у цябе ёсць свой стыль.

— Ёсць, — згадзіўся я, — старанна рыхтавацца да экзаменаў.

М. БУЦЬКО.

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Байрон — романтический романтик.

Произведение Бальзака пронизано жаждой наживы.

Растиньяк — образ из низших высот, но стремившийся достичь высших.

Гашек написал много фельетонов о купцах-саботажниках.

Американская литература реакционная: воспевает мятежи, грабежи.

А. Зегерс эмигрировалась.

Любовь у Адама Мицкевича была неблагополучная.

У Золя умерла бабушка — это тоже огорчение для семьи.

Креонт — это дядя, сидевший на государственном престоле.

Трагедия Шекспира «Дон Жуан и Джульетта».

Флобер ненавидит острые проявления буржуазной пакости.

Фауст — человек-дьявол, он наводит ужас на мелкопоместное дворянство.

Книгу «10 дней, которые потрясли мир» написал Майн-Рид.

Люди шли на войну с богом, но они оставались при своих интересах. (Роман «Огонь» Барбюса).

В Робинзоне встречаются качества человеческой буржуазии.

Вергилий — греческий комедик.

Поэма «Илиада» связана с космическими событиями.

Агамемнон украл пленницу.

В романе «Остров пингвинов» люди превращаются в пингвинов, и ими руководит монах...

Нарождающаяся буржуазия укрощает Катарину («Укрощение строптивой»).

Крупнейшим представителем эпохи Возрождения в итальянской литературе был Петруччо.

Роман «Гаргантюа и Пантагрюэль», на первый взгляд, вызывает неподдельный восторг.

Грешники у Данте находятся в самых дешевых условиях.

Сабраў загадчык кафедры зарубежнай літаратуры Б. П. Міцкевіч.

ТАЛКОВЫ СЛОЎНІК СТУДЭНТА

Банкрот — не сдавший «тысяч».

Бедокурить — курить в неположенном месте.

Варварство—надписи на партах.

Второпях — распространённый метод подготовки задания.

Галоп — темп чтения лекций к концу семестра.

Досрочно — слово редкое.

Досуг — время между сессиями.

Единоличник — один в группе, имеющий конспект.

Едва-едва — традиционное слово экзаменатора.

Залив—место, в поисках которого плавают студенты-географы.

Заочно — метод обучения прогульщика в очном вузе.

Идеалист — первокурсник.

Конспект — записи, которые легко пишутся и трудно читаются.

Лев — студент, сдавший экзамен.

Ловкач — сумевший во время перерыва позавтракать в буфете.

Мородер — собирающий слова у сдавших «тысячи».

Мемуары — студенческая зачетная книжка.

Окоп — задние столы в аудитории.

Поблажка — двойка вместо единицы.

Разведчик — студент, первым сдавший экзамен.

Спринтер — студент, пробежавший 1000 страниц накануне экзамена.

Стипендия — то, чего можно лишиться.

Ураган — экзаменационная сессия.

Фантазия — желание быстро пообедать в столовой между 12 и 14 часами.

Фокусник — студент, списавший со шпаргалки под носом у преподавателя.

Храбрец — (см. разведчик).

Цитадель — портфель студента на столе.

Чудо—1. Стопроцентная явка на лекции. 2. Пятерка в зачетке двоечника.

Читалка — место, где нет места.

Шпаргалка—пережиток прошлого (?).

Эгоист — (см. единоличник).

Язык — то, что студент иногда проглатывает на экзамене.

«МЕРЫДЫЯН» (геафак).

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 15319

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. Заказ 1581.